Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 СТУДЗЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА № 4 (28368)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СІМВАЛ НАДЗЕІ І ЯДНАННЯ

**Праваслаўным хрысціянам Беларусі**

**Дарагія суайчыннікі!**

**Віншую вас з Раством Хрыстовым.**

Гэта светлае свята дорыць нам радасць, напаўняе сэрца любоўю да бліжняга, імкненнем зрабіць свет лепшым. Яно ўвасабляе традыцыі праваслаўя і служыць сімвалам надзеі і яднання людзей у імя перамогі міласэрнасці, чалавекалюбства і дабра. У наш няпросты час менавіта гэтыя каштоўнасці з'яўляюцца асновай мірнага, стваральнага жыцця, неабходнага для дабрабыту і росквіту краіны.

Няхай святочны настрой калядных дзён стане невычэрпнай крыніцай духоўных сіл для працы, творчасці і стасункаў з блізкімі. Будзем імкнуцца да згоды і ўзаемаразумення, шукаць тое, што аб'ядноўвае нас, і разам працаваць на карысць роднай Беларусі.

Жадаю вам моцнага здароўя, аптымізму і здзяйснення запаветных жаданняў.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінскі храм Святога апостала Андрэя Першазванага.

## Закон любові

### Пасланне да Раства Хрыстовага мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

***Хваліце Госпада, усе народы, праслаўляйце Яго, усе плямёны: бо вялікая міласць Яго да нас, і ісціна Гасподняя трывае вечна. (Пс. 116, 1-2)***

*Узлюбленыя ў Госпадзе Праасвяшчэнныя архіпастыры, пачэснае святарства, у Хрысце дыяканства, багалюбівы манаскі чын, дарагія браты і сёстры!*

Сардэчна, са светлай радасцю вітаю вас і віншую з найвялікшай выратавальнай падзеяй: прышэсцем у свет Сонца Праўды — Хрыста, Бога нашага: *«Слова стала плоццю, і жыло сярод нас, поўнае благадаці і ісціны»* (Ін. 1, 14). Любячы Сваё стварэнне, Стваральнік і Спасіцель наш Хрыстос-Бог стаў чалавекам, ва ўсім падобным да нас, акрамя граху. Гасподзь прынёс заблуднаму чалавецтву найвялікшы з усіх дароў — Сваю Божую любоў, каб спасці свет, вызваліць чалавека ад страху смяротнага і ад самой смерці, дараваць паўнату быцця ў Богу і жыццё вечнае кожнаму, хто пачуе заклік Божы і пойдзе за Ім.

У сваім пасланні апостал Павел звяртаецца да карынфскіх хрысціян, а значыць, і да кожнага з нас, з адным з такіх заклікаў: *«Праслаўляйце Бога і ў целах вашых, і ў душах вашых, якія належаць Богу»* (1 Кар. 6, 20).

СТАР. 4

## ЛІЧБА ДНЯ

**133,3 тысячы чалавек**

*уліліся ў пенсійную сістэму Беларусі ў 2016 годзе (у 2015-м — больш за 134,7 тысячы). Сярод тых, хто ў мінулым годзе набыў статус пенсіянера, — 75,8 тысячы жанчын і 57,5 тысячы мужчын. Колькасць атрымальнікаў пенсій у органах па працы, занятасці і сацабароне на 1 студзеня гэтага года дасягнула 2619,3 тыс. чалавек (на 1 студзеня 2016 года — 2592,8 тыс.).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9653 | ▼ |
| Еўра | 2,0716 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17004

■ Нашы дзеці





## Найлепшы падарунак для сябе — падарыць радасць іншым

**МАКАРОННАЕ дрэва, скураныя рамонкі, карціны з цеста, бісеру і стужак, ёлка з цытрусавых... Гэтыя і іншыя дзіўна прыгожыя, неардынарныя і яркія творы, якія давялося пабачыць карэспандэнтам, — работа жыхароў дзіцячага дома №5. Учора зранку звяздоўцы завіталі сюды, нагружаныя мяхамі з сабранымі і набытымі падарункамі. Пакуль ішлі, вельмі хвалявалiся: ці спадабаецца гэта ўсё выхаванцам, ці спатрэбіцца, ці будзе дарэчы...**

Каб пазбавіцца ад няёмкасці, мы папрасілі кіраўніцтва дазволіць наведаць дзяцей непасрэдна ў групах і ні кроплі не пашкадавалі пра гэта. Хлопцы і дзяўчаты, якія спачатку саромеліся, пасля расказалі і паказалі, як і з чаго можна ствараць сапраўды адмысловыя рэчы і нават памяняліся ролямі з нашымі дзяўчатамі з інтэрнэт-рэдакцыі — узялі ў іх інтэрв'ю і знялі гэта на відэа. Шчыра скажам, пачуўшы словы «З вамі Дзмітрый Акуліч, глядзіце нас на нашым сайце» і «Дзякуй вам, нашы маленькія зорачкі, што да нас прыехалі», нават крыху збянтэжыліся, настолькі прафесійна атрымалася гэта ў 11-гадовага падлетка. Думаецца, расце тут наш будучы супрацоўнік. Прыйшлося трымаць марку і адказваць на пытанні. Але пра ўсё па парадку.

Дзіцячы дом №5 знаходзіцца ў перарobленым будынку былога дзіцячага садка. Звонку ён амаль нічым не адрозніваецца ад дашкольнай установы, а ўнутры... Паўсюдна на сценах утульных калідораў работы дзяцей: карціны са стужак, бісеру, нітак, паперы... Пра тое, як убраны пакоі хлопцаў і дзяўчат, я ўжо не кажу. Выглядае ўсё вельмі падамашняму: з дыванамі, тэлевізарамі, канапамі. І ўсюды чысціня, а шматлікія вырабы, зробленыя дзецьмі, ствараюць утульнасць і асаблівы каларыт і атмасферу прыгажосці гэтага месца.

Яшчэ збіраючы і набываючы падарункі, мы ведалі, што маленькія майстрыхі займаюцца рукадзеллем (як мы самі пабачылі, пэўна ўсімі яго відамі), таму сярод гасцінцаў загадзя падрыхтавалі каляровыя ніткі, пяльцы, бісер ды стужкі для вышывання.

Вымаючы з пакета прылады для вышыўкі, мы не маглі стрымацца, каб не пахваліцца дзяўчатам, што набывалі ў краме самыя яркія колеры.

— О, якраз чорны ёсць. Тое, што трэба, — узрадаваліся яны, перабіраючы бісерыны.

Сёлета, як расказалі дзяўчаты, яны больш вышываюць стужкамі, летась — займаліся бісерапляценнем. З бісеру або нітак яны ствараюць таксама завушніцы, бранзалеты і іншыя ўпрыгажэнні і дробныя вырабы. Майстрыхі паказалі нам карціны з бісеру, стужак, цеста. Апошняе, аказваецца, падсушваецца на батарэі ці ў мікрахвалёўцы і размалёўваецца фарбамі.

СТАР. 3

Хлопцы былі рады рыштунку для актыўных гульняў.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## Аплата за абслугоўванне ліфта — па колькасці чалавек

**Удасканальваецца парадак прадастаўлення насельніцтву асобных жыллёва-камунальных паслуг. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У дакуменце замацоўваецца норма, што часова дзейнічала ў 2016 годзе. У адпаведнасці з ёй тэхнічнае абслугоўванне ліфта і санітарнае ўтрыманне дапаможных памяшканняў аплачваюцца спажыўцамі зыходзячы з колькасці грамадзян, зарэгістраваных у жылым памяшканні, а не суразмерна агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія ім належаць або займаемых імі.

Па такім жа прынцыпе спажыўцамі пакрываюцца расходы арганізацый, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) прадастаўляюць жыллёва-камунальныя паслугі, на электраэнергію, што спажываецца на асвятленне дапаможных памяшканняў і работу абсталявання ў шматкватэрных жылых дамах (за выключэннем ліфтаў).

## Ад школьнікаў — пенсіянерам

**Педагогі і вучні Астрашыцка-Гарадоцкай сярэдняй школы, дзе навучаецца і малодшы сын Прэзідэнта Беларусі Мікалай Лукашэнка, прывезлі навагодні паказ і падарункі жыхарам мінскага дома-інтэрната для пенсіянераў і інвалідаў, паведамляе БЕЛТА.**

Ужо больш як два гады школа шэфствуе над домам-інтэрнатам, а таму вучняў і іх педагогаў сустракалі як старых сяброў. Гэтым разам творчая група падрыхтавала паказ «Мадагаскар» па матывах аднайменнага мультфільма.

Яшчэ адной добрай традыцыяй стала дарыць не толькі творчыя, але і смачныя падарункі да святочнага стала. Жыхарам мінскага дома-інтэрната даставілі малочныя прадукты з падворка кіраўніка дзяржавы.

Варта адзначыць, што ў доме-інтэрнаце на вуліцы Ваўпшасава школьнікі частыя госці не толькі на святы. Вучні нярэдка наведваюць пастаяльцаў, працуюць тут на суботніку, прывозяць пачастункі і праводзяць час разам за чаяпіцем.

■ Класныя навіны

# ЗАЛАТЫ ЗАПАС

**«Міністэрства адукацыі будзе ўдзячнае за ўсе меркаванні, падказкі і аналіз, якія тычацца змяненняў у вучэбных праграмах, працы над новымі падручнікамі і ўсяго, што адбываецца ў сістэме адукацыі», — у гэтым запэўніла ўдзельнікаў VI Рэспубліканскага фестывалю педагагічнага майстэрства намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА.**

— Вы — залаты запас сістэмы адукацыі, майстры сваёй справы, педагогі, якія гатовыя вучыць сваіх калег, дзяліцца з імі сваім досведам, знаходкамі, праблемамі і сумненнямі. Унікальная частка педагагічнай супольнасці, — падкрэсліла Раіса Сідарэнка. — Стасункі з прафесіяналамі, аднадумцамі — гэта заўсёды свята. Унікальнасць Рэспубліканскага фестывалю педагагічнага майстэрства заключаецца яшчэ і ў тым, што ўдзел у ім — абсалютна добраахвотны. Лепш за ўсё пра яго запатрабаванасць сведчыць наступны факт — рэгістрацыя для ўдзелу ў фестывалі завяршылася на сайце Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ўсяго за два дні: за гэты час амаль чатыры з паловай сотні педагогаў запоўнілі ўсе вакантныя месцы.

Кожны год у цэнтры ўвагі ўдзельнікаў аказваецца тэма, якая з'яўляецца найбольш актуальнай. Сёлета гэта тэма гучыць так: «Навучаючы — выхоўваем». Мы не можам раздзяліць навучанне і выхаванне. Не можа настаўнік проста прыйсці на ўрок і даваць сваім вучням толькі веды. Я лічу, вельмі важна ў пагоні за найноўшымі тэхналогіямі, за электроннымі адукацыйнымі рэсурсамі не страціць блізкі кантакт з вучнем, яго ўвагу і давер да педагога. На ўроку мае значэнне ўсё: інтанацыя настаўніка, яго ўсмешка, яго жаданне ўзаемадзейнічаць з вучнем. І выхоўвае зусім не лекцыя, а ўсяго адна, але сказаная своечасова, фраза.

Раіса Сідарэнка падкрэсліла, што фестываль цалкам пацвердзіў сваю жыццяздольнасць: за шэсць гадоў існавання ў яго мерапрыемствах узялі ўдзел больш за 2 тысячы настаўнікаў. На фестываль прыязджаюць педагогі з усёй краіны. Толькі ў рамках апошняга было праведзена 77 майстар-класаў. «...Важна, каб навуковыя падыходы, якія існуюць у сучаснай педагогіцы, грунтаваліся на практыцы і выкарыстоўваліся настаўнікамі ў іх рабоце, — падкрэсліла Раіса Сідарэнка. — Мы ўпэўнены, што вынікам фестывалю стане павышэнне якасці адукацыі...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

# З ЛЮДЗЬМІ І ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

### У сацыяльна-працоўнай сферы працуюць сапраўдныя прафесіяналы

**Адной з прыярытэтных задач на 2017 год міністр працы і сацыяльнай абароны Валерый МАЛАШКА назваў удасканаленне аплаты працы ў бюджэтнай сферы. Пра гэта кіраўнік міністэрства заявіў учора на ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным Дню работнікаў сацыяльнай абароны.**

Як вядома, Прэзідэнт даручыў дасягнуць да канца гэтага года сярэдняга ўзроўню аплаты працы ў 500 долараў у эквіваленце ў цэлым па эканоміцы. «Работа ў галіне аплаты працы будзе накіравана на павышэнне ўзроўню даходаў насельніцтва», — сказаў Валерый Малашка.

Сярод іншых прыярытэтаў міністр працы і сацыяльнай абароны назваў аказанне сацыяльнай дапамогі ўсім, хто мае такую патрэбу, задавальненне патрэбы насельніцтва ў сацабслугоўванні, падтрымку сем'яў з дзецьмі, а таксама меры па падтрыманні ўзроўню пенсій з улікам наяўных фінансавых магчымасцяў бюджэту і эканамічнай сітуацыі, паведамляе БЕЛТА.

**Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Васіль ЖАРКО** на ўрачыстым мерапрыемстве ўручыў узнагароды лепшым супрацоўнікам сацыяльна-працоўнай сферы і падзякаваў за адданасць сваёй справе і разуменне важнасці задач, якія стаяць перад сістэмай Мінпрацы і сацабароны.

У сваю чаргу, **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Марыяна ШЧОТКІНА** адзначыла, што ў сацыяльна-працоўнай сферы працуюць сапраўдныя прафесіяналы. Дзякуючы ім гэтая сістэма ніколі і нікога не падводзіла і ніколі нікога не падвядзе, і, па словах Марыяны Шчоткінай, яна з'яўляецца стабільнай, надзейнай, творчай і міласэрнай.

А **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА** назваў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны надзейным партнёрам. «Нас аб'ядноўвае агульная задача — падтрымка людзей у цяжкія моманты іх жыцця», — упэўнены кіраўнік Федэрацыі прафсаюзаў.

Сацыяльна-працоўная сфера з'яўляецца адным з найбольш складаных і шматгранных складнікаў жыцця грамадства. Сёння ў органах па працы, занятасці і сацабароне краіны і ў падпарадкаваных ім арганізацыях працуе больш за 37 тысяч чалавек.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# Без раздзяляльных ліній

### Наша краіна пачала старшынстваваць у Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятыве (ЦЕІ)

**Як паведаміў на чарговым брыфінгу Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў, упершыню ў незалежнай гісторыі Беларусь узначаліла субрэгіянальную еўрапейскую арганізацыю, што знаходзіцца за межамі постсавецкай прасторы.**

— У якасці «тытульнай тэмы» беларускага старшынства, якая адпавядае адметным рысам у дзейнасці ЦЕІ, а таксама інтарэсам усіх краін-удзельніц, беларускім бокам абрана тэматыка сумяшчальнасці ў большай Еўропе («Promoting connectivity in a Wider Europe»), — заявіў Дзмітрый Мірончык. — Беларусь мае на мэце ўдзяляць асаблівую ўвагу злучальнасці і сумяшчальнасці ў Еўропе ў самым шырокім кантэксце. Побач з развіццём транспартнай і лагістычнай інфраструктуры пад гэтым мы разумеем гарманізацыю стандартаў і мытных працэдур, укараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій дзеля спрашчэння гандлю і развіцця трансгранічных паслуг, стымуляванне прадпрымальніцтва ўздоўж шляхоў асноўных транспартных калідораў і іншыя захады, што накіраваны на стварэнне «безбар'ернага асяроддзя» на карысць эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва.

* * *

Адказваючы на **пытанне пра сітуацыю на беларуска-расійскай мяжы,** Дзмітрый Мірончык паведаміў, што вядзецца яе абмеркаванне ў двухбаковым фармаце. Нагадаем, на гэтую праблему ў канцы мінулага месяца звярнуў увагу Уладзімір Андрэйчанка, старшыня Палаты прадстаўнікоў, падчас пасяджэння сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

— Як правіла, у сітуацыі, калі адзін з бакоў хацеў бы нешта памяняць у існуючай практыцы, якая склалася на працягу больш чым дваццаці гадоў, спачатку вядуцца перамовы, потым уносяцца карэктывы, — адзначыў прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства. — Мы прапануем нашым расійскім партнёрам на час правядзення перамоў прытрымлівацца ранейшай практыкі, якая апраўдвае сябе з усіх пунктаў гледжання. Расійскі бок пакуль на гэта не гатовы. Але мы разлічваем, што прамыя зносіны экспертаў будуць спрыяць збліжэнню пазіцый бакоў і выпрацоўцы ўзаемапрымальных рашэнняў.

* * *

Журналісты папрасілі прадстаўніка МЗС пракаментаваць факт, які на днях быў растыражаваны ў інтэрнэт-СМІ — **прызначэнне Літвой спецыяльнага пасла па пытаннях будаўніцтва БелАЭС.**

— Нам пакуль літоўскі бок нічога афіцыйна не паведамляў ні аб коле абавязкаў і паўнамоцтваў, ні пра персаналіі такога пасла, — адзначыў Дзмітрый Мірончык. — Беларусь нязменна выступае за кампетэнтны дыялог па ўсіх пытаннях будаўніцтва БелАЭС па лініі профільных ведамстваў. Тых ведамстваў, якія займаюцца тэмамі энергетыкі, аховы навакольнага асяроддзя, эканомікі, нарэшце, нацыянальных рэгулюючых органаў. Калі літоўскаму боку для больш эфектыўнага дыялогу з намі патрабуецца каардынатар у сценах МЗС, то гэта яе права і гэта можна толькі вітаць. Калі ж гэтая пасада засноўваецца толькі ў мэтах далейшай палітызацыі пытання, пераносу дыскусіі на міжнародныя пляцоўкі, якія часта не маюць ніякага дачынення ні да ядзернай тэматыкі, ні да энергетыкі, ні да экалогіі, то ў такім выпадку — гэта, хутчэй, контрпрадуктыўны крок.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Брычу Леаніду Рыгоравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | **Изолированное помещение, инв. № 422/D-28190 (назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение № 1), площадью 1487,4 кв.м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, г.п. Острино, ул. Гродненская, 7-1** |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425856600002000051, площадью 0,2531 га (назначение – для обслуживания здания магазина «Универмаг») по адресу: Щучинский р-н, г.п. Острино, ул. Гродненская, 7. Земельный участок выделен под капитальное строение, оформление пользования земельным участком будет производиться в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь |
| **Начальная цена продажи** | 72 956,19 (семьдесят две тысячи девятьсот пятьдесят шесть рублей девятнадцать копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 3 648 р. (три тысячи шестьсот сорок восемь рублей) |
| **Продавец** | Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 08 февраля 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 02 февраля 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32, http://grodnoino.by/**



**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе**

**ПО ПРОДАЖЕ 2-КОМНАТНОЙ КВАРТИРЫ (новостройка), расположенной по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 5А, кв. 96**

| Наименование | Начальная цена продажи, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|
| Лот №1. **Изолированное помещение (квартира № 96) с инв. №500/D-708053479**. Назначение: квартира. Адрес объекта: г. Минск, ул. Сурганова, д. 5А, кв. 96. Кол-во жилых комнат – 2. Год постройки – 2012. Этаж – 14. Общая площадь – 72,5 кв.м. Жилая – 37 кв.м. Стены наружные – блоки из ячеистого бетона; стены внутренние и перегородки – блоки из ячеистого бетона, кирпичные, газосиликатные блоки; перекрытия ж/бетонные; полы – цементная стяжка, проемы – оконные ПВХ, двери в квартиру металлопластиковые, лоджия – есть; отделка – оштукатурено; электроснабжение, отопление, водопровод, канализация – имеются, горячее водоснабжение – центральное; радио, телевидение, телефон – есть, мусоропровод, лифт – есть. На праве собственности | 165 000,00 | 16 400,00 | 5% |

**УСЛОВИЯ**

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по 03.02.2017 г. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

Все расходы по оформлению всех документов, связанных с регистрацией сделки купли-продажи Объекта, оформлению прав собственности на Объект, оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона

**ОБРЕМЕНЕНИЕ**

Запрещение (иное): Постановление об аресте КГБ РБ от 03.09.2013 №б/н УД № 13068930027 (арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов))

**Аукцион состоится 07.02.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (квартира) (Лот № 1), **проводимом 7 февраля 2017 г.** (Партизанский МРО).

Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 6 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – **03.02.2017 в 11.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: судебный исполнитель ОПИ Первомайского района г. Минска Анастасия Сергеевна Костюк, 8 (033) 398-13-29.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

# НА ТОЕ СТУДЗЕНЬ, КАБ СТУДЗІЦЬ



## Карэспандэнты «Звязды» — аб усім, што звязана з маразамі

### Месцамі да мінус 32 градусаў

З паўночнымі вятрамі на тэрыторыю нашай краіны наступае вельмі халоднае арктычнае паветра, паведамляе **намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Белгідраметцэнтра Святлана РЫБАКОВА.** Сёння маразы сапраўды ўзмоцняцца. Тэмпература паветра на большай частцы тэрыторыі складзе ад мінус 16 да мінус 22 градусаў. А ўльтрапалярны холад спецыялісты абяцаюць нам менавіта ў ноч на выхадныя.

У суботу і нядзелю будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым усходзе магчымы кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 20—27 марозу, аднак па паўночным захадзе пры праясненнях маразы могуць даходзіць да мінус 32 градусаў. Толькі па паўднёвым усходзе будзе крыху мягчэй, дзе чакаецца ад мінус 15 да мінус 19 градусаў. Тэмпература паветра ў суботу ўдзень складзе 14—20 марозу, у асобных раёнах па поўначы будзе да мінус 21—24 градусаў. У нядзелю ўдзень тэмпературны фон у аснoўным складзе мінус 11—18 градусаў, але ў асобных раёнах будзе каля 20 марозу.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак і аўторак у некаторых раёнах краіны пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы прагназуецца ў межах мінус 13—20 градусаў, пры праясненнях да 25 марозу. Удзень будзе ад 8 да 15 марозу, але ў асобных раёнах — яшчэ да мінус 16—17 градусаў. Толькі па паўднёвым усходзе ўначы чакаецца 7—12 марозу, а ўдзень — ад мінус 3 да мінус 7 градусаў. Маразы пачнуць слабець у сераду. У асобных раёнах пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 5 да мінус 14 градусаў, аднак уначы пры праясненнях яна можа панізіцца да 19 марозу.

### Цяпер дружна прыбіраем

За суткі снегавое покрыва ў краіне павялічылася на 5—10 сантыметраў. А яшчэ нядаўна мы так хацелі сапраўднай зімы з завеяй! Зрэшты, людзі сталага веку памятаюць, што раней такое надвор'е было самым звычайным, як і рэагаванне на яго...

Дарожнікі забяспечылі магчымасць праезду на ўсіх рэспубліканскіх аўтадарогах. Учора на іх працавалі 567 песка- і солеразмеркавальнікаў, 421 трактар, 39 аўтагрэйдэраў, 140 пагрузчыкаў. Для апрацоўкі пакрыцця за суткі было зрасходавана больш за 13 тысяч тон пясчана-солевай сумесі і звыш трох тысяч тон чыстай солі, паведамляе Міністэрства транспарту і камунікацый.

За ноч толькі з вуліц сталіцы было вывезена больш за 3,4 тысячы кубаметраў снегу. На гэтую вахту было выведзена каля 400 адзінак тэхнікі для расчысткі вуліц і вывазу снегу. За ноч высыпана 833 тоны солі і 877 тон пясчана-солевай сумесі. Для вывазу снегу было задзейнічана 80 самазвалаў, у тым ліку 34 ад староннiх арганізацый. Удзень у вытворчым аб'яднанні «Гарраамаўтадар Мінгарвыканкама» планавалі павялічыць колькасць спецтэхнікі прыкладна да 850 адзінак.

Усе гаспадаркі Беларускай чыгункі працуюць у штатным рэжыме. Магістраль мае неабходную колькасць снегаўборачнай тэхнікі для ачысткі чыгуначных пуцей ад снегу на перагонах і станцыях — 24 снегаўборачныя машыны і 39 снегаачышчальнікаў. Учора была задзейнічана адна снегаўборачная машына, на ачыстцы стрэлачных пераводаў і чыгуначных пераездаў ад снегу працавалі 1627 чалавек. Па інфармацыі прэсцэнтра Беларускай чыгункі, затрымак у руху паяздоў з-за ўмоў надвор'я не было.

Да ўборкі дваровых тэрыторый ад снегу падключыліся не толькі прадпрыемствы, але і насельніцтва. У прыватнасці, свой унёсак у расчыстку дваровых тэрыторый зрабілі аўтаўладальнікі. Пры гэтым многія паслухаліся рэкамендацыі ДАІ і пераселі на грамадскі транспарт.

### Кубачак гарбаты, калі ласка!

З учарашняга дня ў Магілёўскай вобласці пачалі функцыянаваць 32 пункты абагрэву і гарачага піцця ад Чырвонага Крыжа.

Скарыстацца іх паслугамі могуць не толькі тыя, хто апынуўся ў цяжкім сацыяльным становішчы, але і ўсе, хто адчувае дыскамфорт ад моцных маразоў. Бо тут не толькі дадуць кубачак гарбаты, але і, напрыклад, памераюць артэрыяльны ціск, ад якога ў гэтыя неспрыяльныя дні пакутуюць метэазалежныя людзі.

— Не паспелі мы адкрыць пункт на Цэнтральным прадуктовым рынку па вуліцы Ціміразеўскай, як сталі падыходзіць першыя людзі, — паведаміў **старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Андрэй НІКІЦІН.** — Гарбату мы прапануем усім, каму холадна, але для тых, хто з розных прычын не мае пастаяннага месца жыхарства і, адпаведна, магчымасці паесці, прыхапілі ежу хуткага прыгатавання. Ёсць у нас таксама шалікі, курткі, іншае цёплае адзенне для тых, хто не паспеў, або не мае магчымасці яго набыць.

Магілёўскі цэнтр часовага (начнога) знаходжання асоб без пэўнага месца жыхарства таксама гатовы ў гэтыя марозныя дні абагрэць і прытуліць магіляўчан, якія ў сілу нейкіх абставін страцілі прапіску і апынуліся без даху над галавой.

### Як уратавацца ад марозу?

На марозным паветры нам дыхаецца лягчэй, а ўсё таму, што ў ім фактычна няма мікробаў, якія больш любяць цяплыню ды вільгаць. Аднак захварэць падчас маразоў усё ж такі прасцей.

— Знешняе асяроддзе абавязкова адбівацца на рабоце ўсіх органаў і сістэм арганізма, але ў нас ёсць магчымасць адаптацыі да розных умоў, — тлумачыць **загадчыца аддзялення прафілактычных аглядаў 24-й гарадской паліклінікі спецмедаглядаў Ірына ГАРОШКА.** — Якой будзе абарончая рэакцыя, залежыць не толькі ад тэмпературы, вільготнасці ці ветру, але і ад таго, ці па надвор'і мы апрануліся, у якім стане наш імунітэт у цэлым, ад нашага ўзросту — дзеці і пажылыя больш успрымальныя да перападаў тэмпературы.

Калі ёсць захворванне нырак, а вы не прыкрылі цёплым адзеннем гэту частку цела, то ў выніку пераахаладжвання атрымаеце абвастрэнне. Тое ж і з суставамі — пра сябе нагадае рэўматызм. У першыя хвіліны знаходжання на адкрытым марозным паветры сасуды сціскаюцца, а таму артэрыяльны ціск можа крыху павышацца, але не крытычна, бо гэта нармальны механізм кампенсацыі. Таму гіпертонікам можна асабліва не хвалявацца.

У ліку першых пераахаладзіцца рызыкуюць і людзі ў стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення, якія страцілі магчымасць крытычна ацэньваць сітуацыю. Або калі чалавек вымушаны доўгі час знаходзіцца на адкрытым паветры.

На марозе не трэба стаяць на месцы. Рух узмацняе цыркуляцыю крыві, у тым ліку ў дробных сасудах. Паляпшаюць кровазварот і расціранні. Неабходна і саграванне знутры, але не алкаголем, а цёплымі напоямі кшталту чаю, кампоту ці морсу.

Калі адчуваеце, што ўсё ж такі атрымалі пераахаладжванне, што нават у цёплым памяшканні вам яшчэ нейкі час холадна, то ў першую чаргу разатрыце замёрзлыя ўчасткі цела з дапамогай якой-небудзь мазі для сагравання, захутайцеся ў коўдру і піце цёплыя напоі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*
**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*
**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*
**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# Найлепшы падарунак для сябе — падарыць радасць іншым




**Малечы прыйшліся даспадобы яркія цацкі.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— А вось гэта першая наша работа з цестам, — кажуць яны і паказваюць на карціну з пузатым самаварам, па вуглах аздобленую абаранкамі ды розным печывам, якія выглядаюць вельмі рэалістычна.

Наташа з дроту і бісеру пляце цацкі: ліс, павукоў, кракадзілаў, папугаяў...

— Спачатку глядзела ў інтэрнэце схемы, цяпер сама ўжо раблю. Больш за ўсё люблю павукоў — магу за 15 хвілін стварыць. Яго можна паставіць на лапкі (яны згінаюцца) ці падвесіць, — кажа яна.

— Я акрамя вырабаў з бісеру раблю фігуркі арыгамі з глянцаваных афішак. Спецыяльна іх выразаю, каб колер быў патрэбны. Чырвоны з чорным лебедзь зроблены з праграмкі кінастужкі «Ведзьма з Блэр», а зялёны з жоўтым — з флаера «Ёлкі-5», — падзялілася Юля, паказваючы на тэлефоне здымкі сваіх работ.

А ў гэты час на Паліну ўжо прымяралі карнавальную сукенку.

— Яна наша самая заўзятая актрыса, — усміхнулася **Алена ХАЦЬКО, намеснік дырэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы.** — Мы да кожнага свята спектаклі ставім, і дзеці з задавальненнем іграюць, ролі разбіраюць. Да прыезду гасцей з Італіі робім канцэрты. А вырабы, якія яны ствараюць, таксама не ляжаць — гэта цудоўныя падарункі, якія таксама да свят разыходзяцца. Нашы выхаванцы ўвесь час нешта майструюць, займаюцца творчасцю. Вольны дзень хіба што нядзеля, калі яны нікуды не ідуць займацца.

Тутэйшыя хлопцы займаюцца футболам, валейболам ды баскетболам, настольным тэнісам і іншымі спартыўнымі гульнямі. Ім мы прынеслі два футбольныя мячы, кеглі, настольныя гульні, наборы для лепкі з гліны і гіпсу. А яшчэ ўсім выхаванцам дасталіся хатнія пантофлі, звязаныя Кацярынай.

— Мячоў якраз хопіць да лютага. Яны нам заўсёды патрэбныя, як і кеды, бо гуляюць хлопцы штовечар, — смяецца Алена Яўгенаўна. — Яшчэ паспяваюць і на дадатковыя заняткі па англійскай мове хадзіць.

У кожнай групе свая ёлка. А ў хлопцаў іх нават тры. Адна звычайная. Другая — склееная са спецыяльна згорнутых кавалачкаў тканіны. Трэцяя — зусім адмысловая — знаходзіцца на сцяне. На шпалерах нацягнуты шнуркі, да якіх прыладжаны банцікі, шышкі і... сушаныя скрылікі апельсінаў, лімонаў, яблыкаў.

А на сцяне, што вядзе ў спальню, «расце» дрэва з макаронаў. Крона зроблена з мучных вырабаў у форме «ракавін», а ствол — з макаронін, ключыкаў, гузікаў і іншага падручнага матэрыялу. Усё гэта пафарбавана і выглядае як заводская пластыкавая выява для дэкору.

Хлопцы дапамагалі ствараць усё гэтае хараство. А Саша, якому ўчора споўнілася 18 гадоў, увогуле вяжа на прутках.

Хлопцы з яшчэ адной групы, як аказалася, таксама займаюцца не толькі футболам, але і бісерапляценнем. А яшчэ: Саша грае на гітары, Андрэй плавае, Вадзім спявае, Арцём малюе і робіць кветкі са скуры.

— Для хакея мы ўжо пачысцілі двор і зрабілі са снегу борцікі і вароты, — паведаміў Саша.

— А яшчэ ў нас турнір варатароў быў. Я ў ім другое месца заняў, адбіў 81 шайбу, а Арсеній — першае. Мы ездзім на хакей у юнацкую каманду «Дынама-Мінск», і я там сябрую з нумарам 35, — паведаміў Дзіма. Менавіта ён пасля браў інтэрв'ю ў адной з нашых карэспандэнтак.

Самым маленькім дасталіся гумавыя мячыкі, машынкі і вясёлыя прописі з лічбамі і літарамі ды іншыя займальныя сшыткі з дыдактычным матэрыялам. Ну, а найбольш расходны матэрыял: каляровыя алоўкі, акварэлькі, фламастары, пластылін, каляровыя ручкі, несумненна, спатрэбіцца ўсім творчым жыхарам гэтага дома.

На зваротным шляху мы заўважылі на падаконніку кампазіцыю са звычайных галінак ва ўпрыгожаным слоіку з вадой. Не паверыце, але на іх з'явіліся не толькі маладзенькія лісцікі, але і суквецці. Так што, думаецца, хутка яны і заквітнеюць. Пэўна, адчуваюць мясцовую атмасферу творчасці і дабрыні.

**Больш здымкаў глядзіце на сайце www.zviazda.by.**

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Падчас дабрачыннай акцыі «Падары дзіцяці свята», якую звяздоўцы ладзілі ў ГУМе 22 снежня, мы разам з работнікамі ўнівермага, нашымі чытачамі і ўсімі неабыякавымі людзьмі, якія далучыліся да збору гасцінцаў для дзяцей з дзіцячага дома №5, назбіралі і набылі ні многа ні мала, а амаль пяць мяхоў падарункаў.**

**Выхаванцы атрымалі мячыкі і кеглі, разнастайныя цацкі: ад мазаікі і машынак да набораў для стварэння гіпсавых магнітаў і гліняных выяў, а таксама шкарпэткі, калготкі і канцылярскія прылады.**

**Дзве плойкі прыйшліся даспадобы доўгавалосым прыгажуням, а футбольныя мячы — юным футбалістам. Настольныя гульні, у якія можна гуляць вялікай колькасцю людзей і пры гэтым развіваць мысленне, складаючы словы і набываючы новыя веды, думаецца, падыдуць усім жыхарам дома. Чулая жанчына Мая Іванаўна, пра якую мы раскажам наступным разам, як і абяцала падчас акцыі ў ГУМе, прынесла некалькі пакетаў з тканінай, ніткамі і пруткамі, што вельмі спатрэбіцца дзяўчатам на ўроках працы. Шыкоўная сукенка, якую яна пашыла сама, стане цудоўным атрыбутам для тэатральных пастановак, якія ладзяць выхаванцы. А Кацярына, якая таксама адгукнулася на нашу прапанову падарыць дзецям свята, літаральна за некалькі дзён звязала спецыяльна для дзетак хатнія пантофлі.**

# Закон любові



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Галоўны сэнс гэтага заклiку заключаецца ў тым, каб мы не толькi дзякавалi Богу i ўзносiлi Яму хвалу ў малiтвах i песнапеннях, але i прынасiлi добры плод — справы любовi i мiласэрнасцi на славу Божую, на карысць Царквы, на карысць Бацькаўшчыны i на карысць блiжняга, несучы *«цяжары адзiн аднаго»* (Гал. 6, 2) — i ў радасцi, i ў горы.

Гасподзь запаведаў нам любiць адзiн аднаго, захоўваць адзiнства царкоўнае, несцi людзям мiр Хрыстоў i дабро, быць лагоднымi i цярплiвымi, быць руплiвымi ў малiтве i ў служэннi слабым i абяздоленым. *«Па тым пазнаюць усе, што вы Мае вучнi, калi любоў будзеце мець памiж сабою»* (Ін. 13, 35), — кажа нам Гасподзь i Спасiцель наш Іісус Хрыстос. Далучаючыся да гэтай уседасканалай Божай любовi, мы здабываем непераможную зброю *«супраць злых духаў паднябесных»* (Эф. 6, 12), здабываем магчымасць паспяхова супрацьстаяць усiм выклiкам часу. Мяккi б спакусы i выпрабаваннi нi спасцiгалi нас у гэтым жыццi, словы Госпада: *«Я з вамi ва ўсе днi да сканчэння веку»* (Мт. 28, 20) усяляюць у нас надзею, што Ён не пакiдае нас сёння i не пакiне ў будучы час.

Закон любовi, завешчаны нам Спасiцелем, ляжыць у аснове сапраўднага *«адзiнства духу»* (Эф. 4, 3). Гэты закон — аснова грамадскага жыцця i салiдарнасцi, супольнай стваральнай працы i супрацоўнiцтва на славу Божую i на радасць тым, хто перажывае розныя беды i няшчасцi, хто церпiць нягоды i мае патрэбу ў нашай дапамозе i падтрымцы. Але сапраўднае яднанне народа не можа абмяжоўвацца толькi часам выпрабаванняў, яно павiнна стаць неад'емнай часткай нашай хрысцiянскай самасвядомасцi i сапраўднага хрысцiянскага жыцця.

Зноў надышло светлае свята Раства Хрыстовага, свята гарачай веры i непасаромленай надзеi на Промысел Божы, якi вядзе да дабра кожнага чалавека. Зноў раскрываецца неба над зямлёю, зноў чуецца ангельскае славаслоўе, якое абвясцiла свету *«радасць вялiкую, якая будзе ўсяму народу: нарадзiўся вам сёння ў горадзе Давiдавым Спасiцель»* (Лк. 2, 10-11). Разам з ангеламi мы зноў заклiкаемся заспяваць славаслоўе Дзiцятку Хрысту, якi нарадзiўся, i, укленчыўшы перад Ім, як гэта зрабiлi ўсходнiя мудрацы, прынесцi ў дар «фiмiям» сардэчнай малiтвы, «золата» добрых спраў на славу Царквы i на карысць блiжняга, «мiра» ахвярнага служэння блiжнiм, i, прыпаўшы да яслях Хрыстовых, як вiфлеемскiя пастухi, славiць i хвалiць *«Бога за ўсё, што пачулi i ўбачылi»*.

Праасвяшчэнныя архiпастыры, дарагiя айцы, браты i сёстры! Мiнулы год быў няпростым для многiх з нас, але, мiласцю Божай, ён прынёс нам i нямала духоўнай радасцi. Ён быў адзначаны шматлiкiмi важнымi падзеямi ў жыццi нашай Царквы. У мiнулым годзе ва ўсiх епархiях архiрэi з клiрам, брацiяй i паствай займалiся вырашэннем надзённых пытанняў царкоўнага жыцця: добраўпарадкаваннем епархiяльнай i прыходскай дзейнасцi, стварэннем яксна новых прыходаў, якiя заклiканы стаць сапраўднымi праваслаўнымi абшчынамi, здольнымi да актыўнага ўдзелу ў царкоўнай мiсii, з уключэннем у iх самай актыўнай сiлы грамадства — моладзi; шмат увагi надавалася развiццю сацыяльных i асветнiцкiх праектаў Праваслаўнай царквы.

У 2016 годзе Беларуская праваслаўная царква i дзяржава працягнулi супольную працу ў галiне аховы i захавання гiсторыка-культурнай спадчыны. Асаблiвая ўвага надаецца захаванню традыцыйных каштоўнасцей беларускага народа, духоўна-маральнаму выхаванню падрастаючага пакалення i прафiлактыцы негатыўных з'яў i iх наступстваў у грамадстве. У аснову культуры i дзяржаўнасцi Беларусi закладзены хрысцiянскiя каштоўнасцi, якiя з'яўляюцца самым верным арыенцiрам не толькi ў жыццi хрысцiянiна, але i асобнага чалавека. Дзяржава сёння падтрымлiвае Царкву ў яе патрыятычных iнiцыятывах i пропаведзi набожнага ладу жыцця.

Святая Праваслаўная царква заклiкае кожнага з нас старанна працаваць над ачышчэннем i праабражэннем сваёй душы, бо духоўная перамена самога сябе — залог i аснова для праабражэння ўсяго народа нашай Бацькаўшчыны.

Дарагiя i ўзлюбленыя ў Госпадзе праасвяшчэнныя архiпастыры i пастыры, iнакi i iнакiнi, браты i сёстры! Ад усяго сэрца з любоўю ў Хрысце зноў i зноў вiншую ўсiх вас з вялiкiм святам Раства Хрыстовага i з Новым годам мiласэрнасцi Божай. Малiтоўна жадаю вам добрага здароўя, мiра, дабрабыту i невычэрпнай дабрадатнай дапамогi Божай у вашых подзвiгах i працы на славу Святой Царквы Хрыстовай, на карысць роднай Бацькаўшчыны i на карысць усiх нашых блiжнiх. Амiнь.

**Спадчына**

# «ЗВОН — ГЭТА ДУША НАРОДА»

## У Беларусi, адзiнай на постсавецкай прасторы, захавалася старажытная традыцыя

**Звон — гэта нешта вельмi жывое. Праз бронзу, з якой адлiты званы, i рукi чалавека, што дапамагаюць нарадзiцца гуку, наша зямля быццам звяртаецца да неба... А, можа, наадварот? Гэты гук, настолькi высокi i чысты, што, магчыма, ён адмыслова быў створаны дзесьцi на вышынi, каб крануць самае чэрствае сэрца...**

**Беларусь — унiкальная краiна: толькi тут, у адзiным месцы на ўсёй постсавецкай прасторы, захавалася традыцыя старажытнага званарства. Інструмент не быў занядбаны часам i лiхалеццямi. Умельства беражлiва перадавалася ад старэйшых маладзейшым. На шчасце, знайшлася i даследчыца, якая вывучыла ўсё гэта i прадставiла шырокай грамадскасцi. Вынiкам нястомнай шматгадовай працы Алены Шацько стала кнiга «Званы Белай Русi: тысячагоддзе традыцыi» (з дадаткам на двух DVD). Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з кандыдатам мастацтвазнаўства, правадзейным членам Асацыяцыi звону Расii, дацэнтам кафедры тэорыi i методыкi выкладання мастацтва БДПУ iмя Максiма Танка, каб распытаць пра традыцыi званарства на Беларусi i пра тое, як ствараўся яе ўнiкальная кнiга.**



Фота Надзеі БУЖАН.

**Алена ШАЦЬКО сама валодае майстэрствам званара. «Гэта вялiкая духоўная радасць», — гаворыць яна аб судакрананнi са званамi.**

***— Алена Генадзеўна, вы iнiцыюеце ўнясенне званарства ў спiс нематэрыяльнай гiсторыка-культурнай спадчыны Беларусi? Цi ёсць нейкiя зрухi ў гэтым працэсе?***

— Сабраны пакет дакументаў, у якi ўваходзяць матэрыялы па званах 19 храмаў Брэсцкай, Мiнскай i Вiцебскай абласцей. Іх гучанне запiсана на прафесiйную апаратуру. Дзякуючы Белтэлерадыёкампанii створана 5 перадач, 3 дакументальныя фiльмы аб званарах i гiсторыi званарства на нашых землях. Прыхаджане храмаў сабралi подпiсы аб тым, што яны становяцца ацэньваюць гучанне званоў i згодны ўнесцi iх у спiс спадчыны (гэта абавязковая ўмова). У дадатку — публiкацыi ў прэсе на гэту тэму. Дакументы аддадзены ў Інстытут культуры Беларусi, дзе на Радзе можа быць прынята адпаведнае рашэнне. Мы чакаем дабраславення мiтрапалiта Мiнскага i Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусi Паўла, бо звон — гэта iнструмент, якi выкарыстоўваецца найперш у богаслужэннях, i без згоды царквы вырашаць такое пытанне неэтычна. Вядома, што Экзарх шмат робiць для зберажэння нацыянальнай культуры, напрыклад, хутка будзе выдадзена Бiблiя на нашай беларускай мове. Таму прыйдзе час прызнання i нашых слаўных званоў — аб гэтым малiцца вернiкi.

***— Раскажыце, у чым унiкальнасць званарства?***

— Варта адзначыць, што размова вядзецца менавiта пра традыцыйнае беларускае званарства. У 19-цi храмах, якiя я даследавала на працягу 10 гадоў, не спыняўся матыў звону — захоўвалася пераемнасць мелодыi, якой званiлi, скажам, сто гадоў таму — яна гучыць i сёння. У храме ёсць свой канон, ён пастаянны. Гэта як народная песня. Справа ў тым, што званарства захавалася толькi ў нас, бо з 1921 да 1939 года ў Заходняй Беларусi была асаблiвая канфесiйна-гiстарычная сiтуацыя: працягвалiся царкоўныя службы, адлiвалiся новыя званы. А ва Усходняй Беларусi ў 1939 годзе быў закрыты апошнi храм — службы нiдзе не праводзiлiся. Тое ж самае адбывалася i на iншай тэрыторыi Савецкага Саюза — iшло поўнае знiшчэнне храмаў i ўсяго, што з iмi звязана. У нас жа працягвалася царкоўнае жыццё — унiкальна тое, што традыцыя званарства не перарвалася. У час Вялiкай Айчыннай вайны вернiкi схавалi свае званы. Атрымлiваецца, што толькi ў Заходняй Беларусi (магчыма, яшчэ ў Заходняй Украiне) нiколi не губляўся гэты канон. У Эстонii быў толькi адзiн манастыр, якi нiколi не закрываўся, — Пскова-Пячэрскi — там захаваўся, 500 гадоў, i традыцыя таксама захавалася.

***— Якiя мясцiны ў Беларусi вы раiлi б наведаць, каб пачуць аўтэнтычны звон?***

— Вёску Дарапеевiчы Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласцi. У 1934 годзе гэтыя званы былi адлiты проста каля царквы, у зямлi, запрошаным майстрам-лiцейшчыкам. Адна жанчына, успамiны якой я зафiксавала, будучы яшчэ маленькiм дзiцем, бачыла, як у яме будавалi печ, як залiвалi медзь. Пасля званы пэўны час астывалi ў зямлi... Яшчэ варта з'ездзiць у Вiлейку, дзе захавалiся дзiвосныя званы XIX стагоддзя, адлiтыя ў Расii. Праўда, побач знаходзiцца шаша: мы запiсвалi iх гучанне ў 5 гадзiн ранiцы i нават дамаўлялiся, каб рух транспарту быў зменены — каб шумы не перашкаджалi. Вельмi цiкавыя званы ў Олтушы таксама Маларыцкага раёна. І ў Маладзечне званы захавалiся.

***— Гучанне царкоўнага звону змяшчае ў сабе шмат iнфармацыi...***

— У храме хрысцiлiся, там моладзь знаёмiлася адно з адным. Там жа адбывалiся заручыны — калi настаяцель паведамляў, што пара збiраецца ажанiцца, пытаўся, цi ведаюць нешта пра яго цi яе — можа, некаму абяцалiся?.. І ў гэты час таксама гучаў асаблiвы звон — на заручыны. Вянчалiся яны пазней, дзесьцi праз месяц — i тады ў наваколлi разлятаўся вянчальны звон (але не ва ўсiх мясцовасцях ён меўся). Затое ўсюды быў пахавальны звон — ён гучаў, пакуль чалавека не данясуць да магiлак. Увявiце, людзi ва ўсёй ваколiцы чулi гэты звон, хрысцiлiся, чыталi малiтву пра навапачылага. А часам яны па звоне разумелi, хто памёр, мужчына або жанчына. Нават з якой вёскi, можна было зразумець — бо часам пэўнае паселiшча магло падарыць храму звон.

***— Сучасныя тэхналогii вядуць да таго, што ў хуткiм часе можна будзе абысцiся без званара. Што вы думаеце наконт гэтага?***

— Цяпер уводзiцца новая сiстэма — «электронны званар» — яна фактычна знiшчае пераемнасць. Лiтаральна на тэлефоне нацiскаецца кнопка i самi сабой пачынаюць званiць званы ў царкве. Гэта можа рабiць настаяцель цi прыхаджанiн — той, хто атрымаў дабраславенне. Такiм чынам мы фактычна руйнуем традыцыю, не даём ёй адрадзiцца, знiшчаем паслушнiцтва. Цi застанецца тады жаданне iсцi ў храм?.. Гэта мёртвае i нежывое. А калi звонiць званар, то ўдзельнiчае яго душа.

***— Вернемся да гiсторыi. Якiя ёсць звесткi пра тое, калi на Беларусi ўпершыню зазванiў звон?***

— Па матэрыялах раскопак, па знойдзеных фрагментах званоў мы ведаем, што ўжо ў XII стагоддзi ў Гродне на Замкавай гары стаяў храм i на iм было тры званы. Падчас пажару яны ўпалi i разбiлiся — у слоi XII стагоддзя знайшлi iх фрагменты. На адным нават ёсць надпiс «рабу». Усе кампаналагi кажуць, што надпiсы на званах з'явiлiся ў XIV стагоддзi ў Расii. А мы знайшлi фрагмент XII стагоддзя. Гэта ўнiкальна!

***— Якiя самыя каштоўныя званы захоўваюцца ў нашай краiне?***

— Мной апiсана 1704 званы з праваслаўных храмаў. Яны пашпартызаваны — сфатаграфаваны, падлiчаны iх памеры, зафiксаваны надпiсы, якiя на iх маюцца, запiсаны гук. Для таго каб сфатаграфаваць, iх трэба было спачатку памыць, — я рабiла гэта сама. Усе гэтыя званы акурат з'яўляюцца старажытнымi — датуюцца XVI—XIX стагоддзямi. Яны выклiкаюць вялiкую цiкавасць. На сённяшнi дзень у нас, як нiдзе на постсавецкай прасторы, захавалася такая вялiкая колькасць званоў. Менавiта ў Заходняй Беларусi (ва Усходняй усё знiшчана, за выняткам таго, што цудам было захавана ў музеях). У часы вайны iх хавалi ад немцаў — закопвалi ў зямлю, затым вярталi. Гэта было самым родным, бо звон — гук населенага пункта. На iх вельмi цiкавыя выявы, старажытныя надпiсы. Напрыклад, у вёсцы Олтуш Маларыцкага раёна надзвычай тонкiя выявы Георгiя Перамаганосца, якi забiвае змея. Яны «тонкiя», бо нават пэндзлем мастака такое складана выявiць, а там адлiта. Прычым адлiваў беларускi майстар Андрэй Белячынскi. Мне б вельмi хацелася, каб пашкоджаныя званы апынулiся ў музеях. Дадам, што пашпартызацыю званоў каталiцкiх храмаў правялi навукоўцы Акадэмii навук Варшавы: яны апiсалi ўсе званы касцёлаў Беларусi i Польшчы яшчэ да 2008 года.

***— Цi ёсць сёння пераемнасць званарскай справы?***

— Дзякуй богу, дзядулi-званары надзвычай ашчадна ставяцца да сваiх званоў, таму яны самi iмкнуцца кагосьцi з вучняў нядзельнай школы навучыць, перадаць майстэрства. Напрыклад, хлопчык з вёскi Дарапеевiчы Маларыцкага раёна Арцём Пацюк, якi цяпер навучаецца ў медыцынскiм унiверсiтэце, навучыўся ў сваёй роднай вёсцы гэтаму майстэрству ад Сцяпана Ярманюка. І ў iншых храмах ёсць пераемнасць. Калi званы ўнясуць у спiс нематэрыяльнай гiсторыка-культурнай спадчыны Беларусi, тады i ў нядзельных школах пры царкве дзецi iх будуць вывучаць. Бо гэта сваё, роднае. Мы павiнны яго зберагаць, як гэта рабiлi нашы бацькi i дзяды.

***— Цi можна сказаць, што звон — гэта таксама пэўны вiд малiтвы, са зваротам да Бога?..***

— Абавязкова. Кожны ўдар звона — гэта малiтва. Часам кажуць, што гэта малiтва ў бронзе. Адначасова гэта i казань. Адзiн святар распавядаў мне, што пэўны чалавек iшоў мiма царквы, ён пачуў звон i вырашыў зайсцi ў храм, а з часам стаў прыхаджанiнам. Сёння звон не выконвае функцыi заклiку да пачатку богаслужэння, бо ў нас ва ўсiх ёсць гадзiннiкi. Ён мае хутчэй мiсiянерскую функцыю — гэта фактычна знешняе богаслужэнне. Я запрашаю чытачоў «Звязды» да ўдзелу ў праекце «Звонсалавей» (падрабязна пра яго можна пачытаць у кнiзе «Званы Белай Русi: тысячагоддзе традыцыi»). Буду рада, калi вы дашляце на мой электронны адрас shatko377@gmail.com аповеды пра званы, пра традыцыi, звязаныя з iмi. Можа, вашы бабулi цi дзядулi ахвяравалi на звон? Магчыма, сярод вашых iкон захоўваецца цудам захаваны кавалачак звона?..

**Нiна ШЧАРБАЧЭВIЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ Кінадаты

# КАР'ЕРНЫ РОСТ ДЗЯНІСКІ КАРАБЛЁВА

## Дзіцячы фільм «Па сакрэце ўсяму свету» адзначае 40-годдзе

**Чатыры дзясяткі гадоў таму, 2 студзеня 1977 года, адбылася тэлевізійная прэм'ера двухсерыйнага фільма «Па сакрэце ўсяму свету», які знялі на кінастудыі «Беларусьфільм» паводле знакамітых «Дзяніскавых апавяданняў» Віктара Драгунскага. Значна пазней гэты фільм крытыкі прызналі дзіцячым блокбастарам, а тады ад яго былі проста ў захапленні савецкія школьнікі-акцябраты і малодшыя піянеры.**





**Уладзімір СТАНКЕВІЧ — Дзяніска Караблёў 40 гадоў таму і цяпер.**

Юнага акцёра на ролю галоўнага персанажа — другакласніка Дзяніскі Караблёва — выбіралі сярод амаль 15 тысяч (!) дзяцей, але камісія Дзяржкіно зацвердзіла мінчаніна Валодзю Станкевіча — сына вядомага беларускага пісьменніка Уладзіміра Дадзіёмава. На той момант Валодзя ўжо меў досвед здымак у 4 кінафільмах і, галоўнае, шчыра любіў «Дзяніскавы апавяданні» — гэту кнігу хлопчык ведаў ледзьве не на памяць.

...Як успаміналі пазней акцёры, настрой савецкага часу ў фільме быў перададзены вельмі дакладна, а вось побыт рэжысёры на чале з Ігарам Дабралюбавым істотна «палепшылі». Напрыклад, штроксавы касцюмчык экраннага Дзяніскі, мара многіх хлопчыкаў у той час, быў страшэнным дэфіцытам, набыць які было практычна немагчыма за любыя грошы. Або ўзгадаць тры сасіскі, якія герой «без апетыту» есць на сняданак — у многіх сем'ях такое меню было далёка не штодзённай раскошай, не гаворачы ўжо пра курыцу, якую Дзяніс Караблёў разам з татам (Аляксандр Лянькоў) «гатуюць» да стану вугельчыкаў — дастаць гэту «сінюю птушку», якая каштавала 2 рублі 20 капеек, лічылася вялікай удачай. Апошняй сцэны, дарэчы, у пачатковым сцэнарыі не было наогул — яе прыдумалі проста на здымачнай пляцоўцы, а ў выніку менавіта яна стала любімай у многіх дарослых і маленькіх гледачоў.

«Прэм'ера мела ашаламляльны поспех, — успамінае сёння Станкевіч, — але адчування, што прачнуўся знакамітым, у мяне не было. Ні на вуліцы пальцам не паказвалі, ні аднакласнікі не зайздросцілі — можа, прывыклі, што я часта здымаюся, ні настаўнікі паблажак не рабілі. Карацей, жыў сабе, як і раней». Аднак на лёс героя карціна ўсё ж такі аказала самы істотны ўплыў.

З больш як дзясятка дзяцей і падлеткаў, якія зняліся ў карціне, толькі Валодзя Станкевіч працягнуў акцёрскую кар'еру. У яго багажы звыш 20 фільмаў, а таксама вопыт працы на беларускім тэлебачанні і ў ансамблі «Сябры». І хоць ужо шмат гадоў Уладзімір разам з сям'ёй жыве ў Маскве, дзе працуе акцёрам і шоўменам, а таксама займаецца раскруткай артыстаў (у тым ліку сваёй жонкі Анжалікі Ют) ва ўласнай прадзюсарскай кампаніі, але дагэтуль захоўвае пяшчотныя пачуцці да карціны і можа правесці для цікаўных віртуальную экскурсію па месцах здымак. Нават у сацыяльных сетках ён падпісваецца як Уладзімір Станкевіч — Дзяніс Караблёў і з задавальненнем згадвае кожную круглую дату любімага фільма.

Напрыклад, да 30-годдзя стужкі «Па сакрэце ўсяму свету» Уладзімір зрабіў яе прыхільнікам адмысловы падарунак — зняў відэакліп на песню «Калі мае сябры са мной». «Я дамовіўся з аўтарамі — Танічам і Шаінскім, а саму песеньку цудоўна выканала мая дачка Вікторыя, якой на той момант было столькі ж гадоў, колькі і мне падчас стварэння фільма, — узгадвае шоумен. — Прычым здымалі відэа мы ў Мінску, якраз на месцах былых здымак — гэта дзіўна, але за 30 год там мала што змянілася». Акрамя таго, да юбілею выйшла эксклюзіўнае выданне на дыску — адрэстаўраваны фільм, дакументальная стужка «Працяг будзе», у якой стваральнікі карціны ўзгадалі пра самыя забаўныя моманты працы, і дадатковы відэакліп.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**
*tselyashuk@zviazda.by*

■ Па той бок экрана

# «ПРЫМУРАК», «КАШТАРЫС» І «ШЧАМЛЁТКІ»

## Як каманда з Міншчыны ўдзельнічала ў тэлевіктарыне «Размаўляем па-беларуску»

**Беларуская мова вельмі багатая, у ёй сустракаюцца слоўцы, невядомыя нават самым апантаным яе прыхільнікам. Не ўсе ведаюць, напрыклад, што такое «халепа», «цапстрыкі», «пляцка» . А што азначаюць фразеалагізмы «на жабін скок», «на свой капыл»? Не кожны зможа прачытаць па памяці вершы беларускіх паэтаў, пазнаць творцаў па фотаздымках або працягнуць радкі песні і адгадаць, хто аўтар тэксту. Прыкладна такія заданні прапануюцца ўдзельнікам тэлевіктарыны «Размаўляем па-беларуску», якая выходзіць у эфір кожную суботу на тэлеканале «Беларусь 3».**



**Кацярына ВЕРНІКОЎСКАЯ, Вольга КАМАРОЎСКАЯ, вядучая тэлевіктарыны Алена ТРАЦЭНКА і Вячаслаў ЦЭХАНОВІЧ *(злева направа)* пасля гульні ў студыі.**

— Мне пашчасціла прымаць удзел у гэтай перадачы. Атрымалася гэта нечакана, — расказала **карэспандэнт раённай газеты «Пухавіцкія навіны» Кацярына ВЕРНІКОЎСКАЯ.** — У рэдакцыю патэлефанаваў Вячаслаў Цэхановіч з Мінска. Ён пацікавіўся: ці ёсць у вас дзяўчына, якая добра ведае беларускую мову? Я ў Мар'інай Горцы заканчвала адзіную ў горадзе беларускамоўную школу. У Інстытуце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта вучылася на кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, дзе выкладалі ў асноўным на роднай мове.

Кацярына, вядома, загарэлася жаданнем праверыць свае веды на практыцы. Але Вячаслаў перaтэлефанаваў і паведаміў, што знайшлі патрэбнага чалавека. Дзяўчыне ён прапанаваў з'ездзіць у Гомель у складзе групы падтрымкі. Але з тым гульцом нешта не атрымалася. У выніку на перадачу трапіла Кацярына Вернікоўская.

— Так лёс звёў мяне з Вячаславам Цэхановічам, намеснікам дырэктара аднаго са сталічных унітарных прадпрыемстваў і з зямлячкай Вольгай Камароўскай, інжынерам па ахове працы Пухавіцкага лягасаса. Да Гомеля, дзе праходзяць здымкі, мы ехалі тры гадзіны. За гэты час пазнаёміліся, патрэніраваліся ў веданні мовы. І адчулі сябе адной камандай. Вячаслаў папярэдзіў нас, навічкоў: галоўнае — не хвалявацца. Ён ужо чацвёрты раз удзельнічаў у тэлевіктарыне. Тэатр пачынаецца з вешалкі, а наш шлях у студыю ляжаў праз грымёрку. З намі працаваў прафесійны візажыст, — успамінае мая суразмоўніца.

Тэма віктарыны — Каляды. Пра святы, якія набліжаюцца, у студыі нагадвала прыбраная ёлка, навагодняя мішура на трыбунах. У Кацярыны і Вольгі вялікага хвалявання не было. На творчы лад настройвала спакойная атмасфера, добразычлівая ўсмешка вядучай, якая перад пачаткам тэлевіктарыны пагутарыла з гульцамі, падбадзёрыла.

У студыі нашы героі пазнаёміліся са сваімі сапернікамі — камандай з Мінска: Андрусь, Хрысціна і Раман працуюць у сферы ІТ-тэхналогій, удзельнічаюць у Беларускай інтэлектуальнай гульні. Акрамя таго, Хрысціна арганізавала курсы для ўсіх ахвотных вывучаць беларускую мову. Вячаслаў, Вольга і Кацярына разумелі: ім будзе нялёгка. Тым не менш, гатовы былі даказаць, што і яны ведаюць мову не горш за мінчан.

— Калі глядзіш перадачу па тэлевізары, то здаецца, што ўсе пытанні простыя, на кожнае з іх ведаеш адказ, — кажа Кацярына. — Зусім інакш, калі стаіш за трыбунай у студыі. Галоўнае — не разгубіцца: хто хутчэй націсне на кнопку, той і адказвае. А гэта некалькі балаў на рахунак каманды. У пачатку гульні мы крыху ўступалі канкурэнтам. Але затым сітуацыя амаль выраўнялася. Мы тлумачылі сэнс фразеалагізмаў, разгадвалі, што такое «прымурак», «каштарыс», «шчамлёткі», усёй камандай спявалі «Мой родны кут» і калядныя песні. Вольга Камароўская, якая адмыслова ведае фальклор, вельмі дапамагла нам.

«Нашым» да перамогі не хапіла зусім крыху: сапернікі абышлі ўсяго на адзін бал. Крыўдна, канешне, але яны ад усёй душы павіншавалі пераможцаў. Не засталіся без падарункаў і самі — ім уручылі кнігі беларускіх аўтараў.

Рэдактар раённай газеты «Пухавіцкія навіны» Вольга Савасцюк шчыра парадавалася за сваю падначаленую і яе сяброў:

— Яны згулялі дастойна, нягледзячы на тое, што на падрыхтоўку было адведзена мала часу. Я нават не ведала, куды едзе Кацярына, калі тая адпрасілася на адзін дзень з працы. Каця займалася ў нас у групе маладых журналістаў, потым мы яе рэкамендавалі для паступлення ў Інстытут журналістыкі БДУ. Пасля заканчэння вучобы ўзялі ў газету. Ведаеце, гэта такі набытак для выдання: яна бярэцца за ўсе тэмы! Цяпер «вядзе» сельскую гаспадарку. Няпросты ўчастак, але малады спецыяліст спраўляецца. Больш за тое, ёй усё цікава. Паедзе на пасяўную, жыво — прыязджае акрыленая, узнёслая: я шмат даведалася новага, сустрэлася з цікавымі, душэўна прыгожымі, працавітымі людзьмі.

Вершы Вольгі Камароўскай раней друкаваліся ў «раёнцы». «Яна заўсёды была блізкай да беларускай мовы», — заўважыла Вольга Савасцюк. Вячаслаў Цэхановіч нарадзіўся ў Мінску, але яго карані таксама ў Пухавіцкім раёне. І ён не забывае радзіму сваіх бацькоў.

— Калі пашчасціць, я не супраць паўдзельнічаць у тэлевіктарыне яшчэ раз, — кажа Кацярына Вернікоўская. — Для гэтага трэба зазірнуць на сайт і прайсці тэст, а яшчэ сабраць каманду аднадумцаў.

А тым часам у Вольгі Савасцюк нарадзілася думка правесці аналагічную раённую тэлевіктарыну сумесна з мясцовай арганізацыяй Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**
*lazovskaya@zviazda.by*

*Паглядзець перадачу можна на тэлеканале «Беларусь 3» у суботу, 7 снежня*

■ Сядзі і глядзі

# ЗІМОВЫЯ СМЯШЫНКІ

***Што:*** **камедыя «Раз на раз не прыпадае»**
***Калі і дзе:*** **«МІР», 10 студзеня ў 9.00**



Новы год добра пачынаць са станоўчых эмоцый — магчыма, таму, шчоўкаючы пультам тэлевізара, мы міжволі затрымліваемся на старых і новых камедыях?..

Сатырычная гісторыя пра брыгаду гора-будаўнікоў выйшла на экраны 30 гадоў таму — і, канешне, сёння будзе цікавая не кожнаму, бо карыкатурны сюжэт і персанажы спісаныя з тых, яшчэ савецкіх, рэалій. Але для настальгічнага настрою — самае тое кіно.

Тры будаўнікі — іх сыграла выдатнае трыа: Армен Джыгарханян, Леанід Кураўлёў і Барыслаў Брандукоў — пры разбурэнні старых збудаванняў знаходзяць схаваныя кімсьці залатыя зліткі. Барацьба паміж сумленнем (здаць скарб дзяржаве і атрымаць законныя 25 працэнтаў узнагароды) і скнапнасцю (усё прысвоіць і падзяліць на траіх) завяршаецца перамогай апошняй. Але на гэтым праблемы будаўнікоў толькі пачынаюцца...

***Што:*** **трагікамедыя «Найноўшы запавет»**
***Калі і дзе:*** **АНТ, 13 студзеня ў 0.10**



Прыемная навіна для вернікаў: Бог ёсць. Шок для іх і ўсіх астатніх: Стваральнік зусім не такі, якім яго ўяўляюць і апісваюць людзі, — прынамсі, паводле версіі рэжысёра гэтай франка-бельгійскай хуліганскай казкі.

Бог жыве ў Бруселі, які сам жа і стварыў. Больш за тое, у яго ёсць сям'я: жонка, дачка і сын, а яшчэ цудоўны камп'ютар, праз які, уласна, адбываецца кіраванне светам. Аднойчы, пасварыўшыся з бацькам, дачка збегла з дома праз пральную машынку, перад гэтым падсунуўшы маштабную свінню — адправіўшы ўсім людзям даты іх смерці і паламаўшы камп'ютар. Прыгоды дзяўчыны ў свеце людзей і яе спробы знайсці сваіх апосталаў і напісаць уласнае евангелле — гэта дзе з'едлівы сарказм, а дзе іранічныя кпіны з сучаснага грамадства, якое ледзь не стопрацэнтна «завісае» ў сацыяльных сетках і задумваецца пра вечныя каштоўнасці хіба раз у год з вялікай нагоды.

***Што:*** **камедыя «Чалавек-аркестр»**
***Калі і дзе:*** **«Беларусь 3», 15 студзеня ў 21.05**



Бліскучы Луі дэ Фюнэс, лёгкі французскі гумар і жыццёвая гісторыя з налётам пікантнасці — выходзіць, камедыя.

Балетны імпрэсарыа Эван-Эванс разам з пляменнікам Філіпам пільна сочыць, каб ягоныя танцоркі не мелі стасункаў з мужчынамі, бо гэта перашкодзіць працы. Але адна з балерын ужо мае дзіця, якое знаходзіцца ў Італіі пад наглядам карміцелькі. Падчас гастроляў патрабуецца тэрмінова шукаць ёй замену, і сяброўкі-танцоркі прапануюць падкінуць малое Эвансу, выдаўшы за пазашлюбнага сына Філіпа. Пасля доўгіх пошукаў Эванс знаходзіць дом сяброўкі пляменніка... атрымлівае на рукі другое дзіця і ледзь паспявае ўцячы ад раз'юшаных сваякоў дзяўчыны. Цяпер у балетнай трупе — двое дзяцей і суцэльны вар'яцкі дом... ■

## Панядзелак, 9 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.25** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.10, 13.10 Меладрама «Учора. Сёння. Назаўсёды...»**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Сваты-3». Заключная серыя.**
**16.30 Серыял «Сваты-4».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**23.55** Дзень спорту.
**0.10 Меладрама «Пагавары са мною пра каханне».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 11.05, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05 Фільм — дзецям «Папялушка».**
**10.10 Фільм — дзецям «Гусятніца».**
**11.40** Капейка ў капейку.
**12.15, 15.50 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**13.10 Серыял «Шчаслівыя разам 4».**
**14.55** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвэл-шоу.
**16.45 Драма «Форэст Гамп».**
**19.15** Суперлато.
**20.05** Рэпарцёр.
**20.50** «Вяселле ўсляпую». Рэаліці-шоу.
**22.00** КЕНО.
**22.10** «Багіня шопінгу». Фэшншоу.
**23.10** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Смажанка з пеўнем. Герос.
**8.05, 12.25, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Майстар і Маргарыта». Драма.**



**9.10 «Маленькія ўцекачы». Камедыя.**
**10.30** «Тэатр у дэталях». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Ноч на Калядзы».
**10.55** «Гітара па крузе».
**11.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці опернага спевака, народнага артыста СССР Мікалая Варвулёва.
**12.40** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.10** «Нацыянальны хіт-парад».
**14.00** «Па хвалях нашай памяці». Савецкі экран.
**14.50, 19.30** «Крамлёўскія лейтэнанты». «Старэйшы сын. Помста Сталіну».
**15.40, 21.00** «Крамлёўскія лейтэнанты». «Лёс лейтэнанта Хрушчова».
**16.20, 21.40 «Дзяржаўная граніца». Серыял. «Год сорак першы».**
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00, 18.55** PRO спорт. Навіны.
**8.10** «Аляксандр Пракапенка. Народны футбаліст». Дак. фільм.
**9.00, 22.40** Тэніс. Турнір WTA. Сіднэй.
**17.00** «Жанчыны і спорт».
**17.30** Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Спрынт. Мужчыны.
**19.05** Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Спрынт. Жанчыны.
**20.30** Футбол. Цырымонія ўзнагароджання ФІФА.
**22.00** PRO спорт. Вынікі тыдня.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Угадай мелодыю».
**15.00, 16.20** «Сёння ўвечары».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Бесталковыя нататкі»
**19.00** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Грачанка».**
**22.40** «У пошуках Дон Кіхота».
**23.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Зорка чароўнага шчасця».**
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** Музычнае шоу «Дзве зоркі» на СТБ. Першы сезон.
**22.15** «Глядзець усім!»
**23.05** «Тайны Чапман».
**23.55 Маст. фільм «Інспектар ДАІ».**
**1.20** Дакументальны праект: «Легенды СССР».

### МІР

**6 .00, 5.35** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Тамарка».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 0.20 Маст. фільм «Чароўны брыльянт».**
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**19.20, 3.00 Серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».**
**22.15 Маст. фільм «Жаданне».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.45, 11.35 Маст. фільм «Самазванка».**



**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Васіліса».**
**19.10, 20.40 Серыял «Шаманка».**
**21.45, 23.30 Серыял «Скліфасоўскі».**
**0.25 Серыял «Саша добры, Саша злы».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** Серыял «Адвакат».
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**9.45** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Браценікі».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «За мяжой».
**14.10, 16.25 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Павуцінне».**
**23.05** «ЧП.by».
**23.25 Серыял «Пад прыкрыццём».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Камедыя «Знаёмства з бацькамі».**
**13.00 Серыял «Імперыя».**
**13.50 Прыгоды «Парк Юрскага перыяду-2».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад». «Рыбка Поньо на ўцёсе».
**17.40 Серыял «Людзі ў дрэвах».**
**18.30 Серыял «Падмані мяне».**
**19.20 Серыял «Флэш».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Вартавыя Галактыкі».**
**23.10 Серыял «Ганібал».**

### ВТБ

**6.00, 1.30** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.40** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны».
**9.30** Камедыя «All inclusive, або Усё ўключана!»
**11.20, 5.00** Серыял «Сакратар».
**12.20** «Паспецъ за 24 гадзіны».
**13.20** «Смачная планета».
**14.00** Серыял «Татавы дочкі».
**16.00, 3.00** Серыял «Нанаканне».
**17.00, 22.45** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Прынц Сібіры».
**21.00** Камедыя «Білет на Vegas».
**23.30** Серыял «Месяц».
**0.30** «Не можа быць!»
**4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.30** «Лаві момант».

### Культура

**7.00** «Еўранъюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Назіральнік».
**11.15** «Бацькі і дзеці». Маст. фільм. 1-я серыя.
**12.30** 100 гадоў з дня нараджэння Таццяны Панковай. «Лінія жыцця».
**13.25** «Маналог». Маст. фільм.
**15.10** «Вялікі Гэтсбі». Маст. фільм.
**17.35** Шэдэўры рускай сімфанічнай музыкі. П. Чайкоўскі. Уверцюра-фантазія «Гамлет». Уверцюра-фантазія «Рамэа і Джульета».
**18.15** «Агюст Манферан». Дак. фільм.
**18.45** Жывы Сусвет. «Месяц. Вяртанне».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Сацi. Нясумная класіка...»
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** Ступені цывілізацыі. «Гісторыя Старажытнага Егіпта». Дак. фільм.
**22.15** Да 60-годдзя Нача Дуата. «Руския сезоны». Дак. фільм.
**23.00** «П'едэстал прыгажосці. Гісторыя абутку з Рэнатай Літвінавай». Фільм першы.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Багатая нявеста». Маст. фільм.
**1.20** Песні і танцы народаў Расіі.
**2.40** П. Чайкоўскі. Фрагменты музыкі балета «Спячая прыгажуня».
**2.50** «Фрэнсіс Бэкан». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Зямля—Паветра». Рыгор Лепс. 2003 год.
**7.25** Маст. фільм «Старая, старая казка».
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.00** Маст. фільм «Добры дзень, я ваша цётка!»
**11.35, 17.45, 18.55, 20.25, 21.40, 23.00, 1.15, 3.40, 4.50** Музычная настальгія.
**12.00** «Мы вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресение». 1994 год.
**13.10** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
**13.55** «Праграма А». 1990 год.
**15.30** Маст. фільм «Дом, які пабудаваў Свіфт».
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Уладзімір Высоцкі». 2005 год.
**19.20** Маст. фільм «12 крэслаў». 1-я серыя.
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Навагодні выпуск. 2008 год.
**1.25** Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры». «Прыгоды працягваюцца».
**2.35** Канцэрт «Спявае ВІА «Синяя птица». 1979 год.
**4.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2011 год.
**5.00** «Песня-79». 2-е аддзяленне.

### EuroSport 1

**3.30, 13.30, 17.00, 1.30** Зімовыя віды спорту.
**4.30, 7.15, 16.00, 19.00, 22.00** Біятлон. Кубак свету.
**5.00, 9.30, 1.00** Ралі-рэйд «Дакар».
**5.30, 8.30, 18.00, 23.15** Лыжныя гонкі. «Тур дэ Скі».
**6.15, 9.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**10.00, 12.00, 23.45, 2.30** Тэніс. Турнір АТР.
**14.30** Канькабежны спорт. Чэмпіянат Еўропы.
**20.00** Футбол. «ФІФА».
**20.30** Футбол. Цырымонія ўручэння ўзнагарод ФІФА.
**0.45** Watts.

### Кінакамедыя

**1.10** Камедыя «Джым з Пікадзілі».
**2.55** Камедыя «Supernянь-2».
**4.35, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**5.15** Камедыя «Вялікае вяселле».
**6.50** Камедыя «100 мільёнаў еўра».
**8.35** Камедыя «Бінга Бонга».
**10.30** Меладрама «Вясельны разгром».
**12.20** Камедыя «Бармен».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Закаханы і безбройны».
**17.40** Меладрама «Гісторыя кахання, або Навагодні розыгрыш».
**19.30** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
**21.05** Камедыя «Жудасны Генры».
**22.45** Камедыя «Утаймаванне свавольнага».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.10** «Доктар I...»
**8.40, 18.45, 2.45** «Асколкі». Серыял.
**10.15** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.00** «Асцярожна, махляры!»
**12.30** «Без падману».
**13.20** «Палярны рэйс». Камедыя.
**15.00** «Дзевяностыя».
**15.55** «Містыка адносін».
**16.55** «Мода з рызыкай для жыцця». Дак. фільм.
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**20.40, 1.55** «Ежа, я люблю цябе».
**21.40** «Рэвізора».
**22.45, 4.20** «Развітанне».
**23.35** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.20** «Ноэль». Драма.
**5.05** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.10, 18.05** Меладрама «Версальскі раман».
**8.15** Драма «Жнівень».
**10.20** Драма «Баец».
**12.20** Драма «Гульня ў імітацыю».
**14.20** Трылер «Паляўнічыя на траляў».
**16.15** Камедыя «Прывіды былых сябровак».
**20.10** Фэнтэзі «Акадэмія вампіраў».
**22.05** Меладрама «Снежанскія хлопчыкі».
**0.00** Вестэрн «Цёмная даліна».
**1.55** Трылер «Востраў праклятых».
**3.55** Меладрама «Салодкі лістапад».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Фэнтэзі «Ваўкадаў».
**8.50** Мюзікл «Галасы вялікай краіны».
**10.50** Камедыя «Мама дарагая!»
**12.35** Драма «Марыяна».
**14.10** Прыгоды «Пуцёўка ў жыццё».
**16.10** Драма «Географ глобус прапіў».
**18.20** Драма «Сіндром Пятрушкі».
**20.20** Меладрама «Атаманы Іван».
**22.10** Прыгоды «Яраслаў. Тысячу гадоў таму».
**0.10** Трагікамедыя «Апошні забой».
**2.00** Камедыя «Сняданак у таты».
**4.00** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».

### National Geographic

**6.00, 13.20** Гульні розуму.
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 11.00, 14.50** Мегазаводы.
**8.40, 15.40, 22.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**9.30, 18.00** Забіць Рэйгана.
**11.45, 16.25, 20.15, 23.25, 2.30** Расследаванні авіякатастроф.
**12.35, 19.30, 21.50, 1.45, 4.50** Навука будучыні.
**21.00, 0.55, 4.05** Антарктыка.
**0.10, 3.20** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**11.00, 19.00** Выжыць разам.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** У пошуках скарбаў.
**20.00** Выжыванне без купюр.
**1.00, 6.20** А ты б выжыў?
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.

## Субота, 14 студзеня

### Беларусь 1

**6.25** Існасць.
**6.50 Меладрама «Правінцыялка».**
**8.30** Буйным планам.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50 Серыял «Сваты-4»**
**10.55** 50 рэцэптаў першага.
**11.40** Спецыяльны рэпартаж.
**12.10** Трансфармацыя.
**12.45** Здароўе.
**13.35, 15.45 Меладрама «Не было б шчасця...»**
**15.15** Краіна.
**18.10 Меладрама «Сем вёрстаў да нябёсаў».**
**20.00, 21.40 Меладрама «Трылані на алмазнай сцежцы».**
**21.20** Панарама.
**0.05 Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчаты».**
**1.30** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05 Фільм — дзецям «Залатая гусь».**
**8.35, 22.05** Тэлебарометр.
**8.40** Анімацыйны фільм «Шрэк Трэцi».
**10.15** Анімацыйны фільм «Шрэк. Назаўсёды».
**11.50 Серыял «Шчаслівыя разам 4».**
**13.40** Капейка ў капейку.
**14.15** Рэпарцёр.
**15.05 Камедыя «Аднакласнікі».**
**16.50** «Бітва экстрасэнсаў. 14-ты сезон».
**18.50** «Веселле ўсляпую». Рэаліці-шоу.
**20.10 Фэнтэзі «Уладар стыхій».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.10** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці.
**23.30 Драма «Эмпайр Стэйт».**

### Беларусь 3

**7.45** «Сіла веры».
**8.10** «Беларуская кухня». Капыткі з мачанкай.
**8.40, 13.15, 20.25** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.55 «Чалавек-аркестр». Камедыя.**
**10.15** «Край».
**10.40** «Разважаем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.10** «Я хачу гэта ўбачыць!» Глыбокае.
**11.40** «Навукаманія».
**12.05** «Камертон». Рэжысёр, прадзюсар, народны артыст Расіі Уладзімір Хаціненка.
**12.35** «Апошні дзень». Кацярына Фурцава.
**13.30** «Тэатр у дэталях». Опера «Кармэн». Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь.
**13.55** «Подых струн».
**14.35** «...Не рвуся я к славе...» Канцэрт.
**15.40 «Снягурка». Казка.**
**17.10 «Зялёны фургон». Драма.**
**19.30** «Па хвалях нашай памяці». Мой адрас — Савецкі Саюз.
**20.40** «Калыханка».
**21.05** «Час кіно».
**21.10 «Парыжскія тайны». Прыгоды.**
**22.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці дыктара Беларускага радыё Уладзіміра Бузука.
**23.20** М/ф.

### Беларусь 5

**8.00, 20.25** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Баскетбол. Еўраліга. ЦСКА (Расія) — «Мілан» (Італія).
**9.55** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Беларусь — Чылі.
**11.25** Піт-стоп.
**11.55** «Два бакі алімпійскага медаля». Марыя Мамошук.
**12.25** Хакей. КХЛ. «Куньлунь РС» (Кітай) — «Дынама-Мінск».
**14.45** Біятлон. Кубак свету. Рупольдынг. Спрынт. Мужчыны.
**16.20, 20.35** Біятлон. Кубак свету. Рупольдынг. Спрынт. Жанчыны.
**17.50** «Жанчыны і спорт». Ала Цупер.
**18.20** Тэніс. Турнір WTA. Сіднэй. Фінал.
**22.05** Хакей. КХЛ. «Куньлунь РС» (Кітай) — «Дынама-Мінск».

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Сяргей Шакураў. «Улюбляцца трэба часцей».
**10.30** «Смак».
**11.15** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.05** Тэлечасопіс «Гумарынка».
**13.20** «Удача ў дадатак!» з «Еўраопт».
**14.05** Да 110-годдзя Сяргея Каралёва. «Галоўны».
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Марсіянскі сшытак Сяргея Каралёва».
**17.25** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**18.35** Вялікі святочны канцэрт.
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.35** «Усё складзецца».
**23.15 Меладрама «Ноч адзінокага філіна».**

### СТБ

**6.00** Дакументальны праект: «Тайны нашай планеты».
**7.35** «Анфас».
**7.50 Маст. фільм «У матросаў няма пытанняў».**
**9.20** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.00** «Іншая краіна». «Перу. Зямля інкаў».
**10.30** «Далёкія сваякі».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 Камедыя «Суперцешча для няўдачніка».**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40** «Адкрытая размова».
**13.55** «Самая карысная праграма».
**14.30** Гала-паказ «Падарожжы».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.50** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.45, 20.10** Музычнае шоу «Дзве зоркі» на СТБ. Другі сезон.
**20.00** «СТБ-спорт».
**21.55** Дакументальны спецпраект: «Вам і не снілася».
**0.10 Камедыя «Суперцешча для няўдачніка».**

### МІР

**6 .00, 3.15** М/ф.
**7.55** «Саюзнікі».
**8.30** «Я — валанцёр».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Медыцынская праўда. Выпрабаванне святам».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45, 0.15 Маст. фільм «Чыста англійскае забойства».**
**13.45** «Цяжар абеду».
**14.15 Маст. фільм «Старыя-разбойнікі».**
**16.15 Серыял «Прыгажуня».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.45 Маст. фільм «Хтосьці губляе, хтосьці знаходзіць».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.30 Камедыя «Штрафны ўдар».**
**13.10, 14.15** «Петрасян шоу».
**14.50 Камедыя «Памылкі кахання».**
**16.40 Маст. фільм «Прынцэса з Поўначы».**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «неГолубой огонек — 2017».
**22.40 Маст. фільм «Падмена».**

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.20 Серыял «Злачынства будзе раскрыта».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Вуснамі дзіцяці».
**9.05** «Навагоднее падарожжа Дзеда Мароза».
**10.25** Галоўная дарога.
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.00** Кватэрнае пытанне.
**12.55** «Паедзем, паядзім!»
**13.20** «Удача ў дадатак!»
**14.20, 16.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.20 Серыял «Павуцінне».**
**22.40 Серыял «Пад прыкрыццём».**

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.15, 21.15, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.40 Трылер «На грэбні хвалі».**
**11.25 Камедыя «Паляўнічыя на прывідаў».**
**13.45 «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Рабінзон Круза».**
**15.15 «Глядзім усёй сям'ёй». Серыял «Аднойчы ў казцы».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Айцец Браўн».**
**17.35, 19.20 Серыял «Навагодні перапалох».**
**20.55** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Баявік «Спектр».**

### ВТБ

**6.00, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** Скетч-шоу «Даешь моладзь».
**7.30** «Ералаш».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.50** М/ф «Фіксікі».
**9.10** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.30** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!»
**10.30** Серыял «Татавы дочкі».
**11.30** «Смачная планета».
**12.00** Серыял «Гатэль «Элеон».
**13.30, 1.00** «Турбаміксер».
**15.30** Прыгоды «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».
**17.40** М/ф «Маленькі прынц».
**19.40** Трылер «Чырвоныя агні».
**21.50** «Уральскія пельмені».
**23.20** Камедыя «Рэальныя ваўкалакі».
**4.30** «Лаві момант».
**5.00** «Празорлівая».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Жаданне кахання». Маст. фільм.
**12.35** «Аляксандр Збруеў. Мужчынская гутарка». Дак. фільм.
**13.20** «Год вожыка». Дак. фільм.
**14.10** Да 100-годдзя з дня нараджэння Яўгена Лебедзева. «Больш чым каханне».
**14.50** Спектаклі-легенды. Яўген Лебедзеў, Валянціна Ковель, Алег Басілашвілі, Міхаіл Волкаў у спектаклі БДТ «Гісторыя каня». Запіс 1989 года.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Стары Новы год». Маст. фільм.
**19.50** Новы год на канале «Культура» з Уладзімірам Співаковым.
**22.30** Каралеўскае кіно. «Жанна Пуасон, маркіза дэ Пампадур». Маст. фільм.
**1.45** «Камунальная гісторыя». «Маё жыццё». М/ф для дарослых.
**1.55** «Там, дзе рыбы ўмеюць хадзіць». Дак. фільм.
**2.50** «Джордж Байран». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». «Вечны пост». Аляксандр Башлачоў. 2006 год.
**7.00** Дак. фільм «БГ». (Барыс Грабеншчыкоў).
**7.20, 1.20** Маст. фільм «12 крэслаў».
**8.35, 9.40, 15.40, 20.30, 0.50, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00** «Песня-80». 2-е аддзяленне.
**12.00** «Да і пасля паўночы». 1990 год.
**14.20** «Іосіф Бродскі. Паэт пра паэтаў». 1992 год.
**16.00** «Колба часу».
**17.00** «Кінапанарама». «Юбілейны выпуск. 20 гадоў». 1982 год. 1-я частка.
**18.00** «КВЗ 87-88». Трэцяя сустрэча. Каманды НДУ і 1-га ЛМІ. 1-я частка.
**19.00** «Ранішняя пошта». 1986 год.
**19.30** «Творчы вечар Аркадзя Арканава». 1990 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**21.55** Маст. фільм «Мы, ніжэйпадпісаныя».
**0.00»** Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар: трыа «Мерыдиан». 2008 год.
**5.30** Праграма «Чалавек і закон». 1987 год.

### EuroSport 1

**3.30, 5.00, 8.00, 1.00** Ралі-рэйд «Дакар».
**4.00, 7.00, 17.45, 22.00, 1.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**5.30** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**6.00, 16.00, 19.45, 22.45** Біятлон. Кубак свету.
**8.30** Тэніс. Турнір АТР.
**10.30** Тэніс. Australian Open. Кваліфікацыя.
**11.30, 23.45, 2.30** Тэніс. Турнір АТР. Сіднэй. Фінал.
**13.30** Санны спорт. Кубак свету.
**14.15** Горныя лыжы. Кубак свету.
**21.00** Зімовыя віды спорту.

### Кінакамедыя

**1.05** Камедыя «Ён горшы за мяне».
**3.00** Камедыя «Нянькі».
**4.40** Камедыя «Закахаць і абясшкодзіць».
**6.40** Камедыя «Аксамітныя ручкі».
**8.30** Камедыя «Супер Лола».
**10.10** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусціць усіх цябе ненавідзець».
**12.10** Прыгоды «Фантамас».
**14.00** Камедыя «Піжон».
**15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
**17.35** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-2».
**19.15** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-3».
**20.45** Камедыя «Superняня-2».
**22.25** Меладрама «Законы прывабнасці».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.00** «Доказ віны».
**11.35, 1.15** «Скрыня Пандоры». Серыял.
**15.00** «Турба». Анімацыйны фільм.
**16.35** «Гучныя справы».
**17.40** «Дзевяностыя».
**18.35, 4.15** «Вулічная магія».
**19.10** «Каханне напракат». Меладрама.
**21.15** «Людзі Ікс 4». Фантастыка.
**23.05** «Жарабец».
**23.50** «Звышнатуральнае». Серыял.
**4.40** «Імя — зашыфраваны лёс».

### ТБ1000

**6.10, 18.20** Меладрама «Нешта новенькае».
**8.00** Меладрама «50 першых пацалункаў».
**9.50** Трылер «Эфект матылька».
**11.50** Драма «Джэры Магуайэр».
**14.20** Баявік «Хутчэй кулі».
**16.10** Драма «Матч-пойнт».
**20.10** Драма «Абуджэнне».
**22.25** Трылер «Драйвер на ноч».
**0.10** Меладрама «Найлепшае ўва мне».
**2.15** Драма «Хлусня дзеля выратавання».
**4.10** Фантастыка «Галодныя гульні. Сойка-перасмешніца». Частка І.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Жаніх».
**8.20** Баявік «Адваротны адлік».
**10.30** Фантастыка «Адарванне».
**12.25** Дэтэктыў «Брыльянты для дыктатуры пралетарыяту».
**14.10** Меладрама «Вязень старой сядзібы».
**16.15** Драма «Кандагар».
**18.20** Камедыя «Стаўка на каханне».
**20.20** Камедыя «Пра што гавораць мужчыны».
**22.20** Меладрама «Снежны анёл».
**0.20** Драма «Сын».
**2.20** Драма «Белая белая ноч».
**4.45** Камедыя «8 новых спатканняў».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00, 11.05, 13.25, 15.40, 17.10, 19.30, 21.45, 22.35** Аўта-SOS.
**23.20, 3.10, 4.45** Дзіўная Другая Сусветная.
**0.05** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**0.50** Дагістарычныя монстры Гітлера.
**1.35** Абаронцы культурнай спадчыны.
**2.25** Напад нацыстаў на ЗША.

### Discovery

**8.00, 17.00** Космас навыварат.
**9.00** Паляўнічыя на склады.
**10.00** Ліквідатар.
**11.00, 23.00** У пошуках скарбаў.
**12.00** Траса Калыма.
**13.00, 1.00** Аляска: сям'я з лесу.
**14.00, 22.00** Аляска: апошні рубеж.
**15.00** Апошнія жыхары Аляскі.
**16.00, 21.00** Інжынерныя пралікі.
**18.00, 7.10** Калекцыянеры аўто.
**19.00, 0.00** Аўтальянцы.
**20.00** Вулічныя гонкі.
**2.00** Выжыць разам.
**4.40** Браты Дызель.

## ВЫ ЗВОЛЬНЕНЫ!

**Часам кіраўніцтва дэманструе цуды знаходлівасці, спрабуючы прыдумаць прычыну для звальнення непажаданага супрацоўніка, калі недастаткова банальных спазненняў, ляноты ці проста дрэннай працы. Але часам самі работнікі ствараюць для гэтага прыдатныя сітуацыі — як сур'ёзныя, так і кур'ёзныя.**



Гэтая гісторыя адбылася на птушкафабрыцы, дзе працавалі двое прыяцеляў. У іх задачу ўваходзіла ўкладваць апрацаваныя тушы птушкі на стужку тэрмінала для наступнай ўпакоўкі. Неяк сябры знайшлі на вуліцы здохлага грыфа. Вырашыўшы, што такая экзатычная птушка абавязкова парадуе пакупнікоў больш, чым курыца, хлопцы адправілі грыфа на ўпакоўку. Праўда, пасля гэтага іх бліскучая кар'ера на птушкафабрыцы была скончана.

Папрацаваць у цырульні маладой супрацоўніцы давялося толькі пару месяцаў. Да таго моманту, калі яна вырашыла пераключыць радыёстанцыю, якая ўвесь час іграла ў салоне. Такая «самадзейнасць» не прыйшлася даспадобы начальству, і супрацоўніца была ў гэты ж дзень звольненая. Ці, можа, ім проста музыка не спадабалася?

Нейкі менеджар так любіў сваю працу, што быў у захапленні ад усяго, што адбывалася ў калектыве. У яго абавязкі ўваходзіла аўтаматызацыя працэсаў прадпрыемства. Аднойчы ў кампаніі абвясцілі новы конкурс, падчас якога планавалі перагледзець абавязкі супрацоўнікаў, непатрэбныя кадры скараціць. Менеджар так актыўна ўзяўся паказваць сваю значнасць начальству, што браўся за любую працу, выконваў усе даручэнні. У ходзе гутаркі бос паведаміў яму, што яго дзейнасць дапамагла настолькі аўтаматызаваць усю работу на прадпрыемстве, што менеджару больш няма чаго рабіць, акрамя як звольніцца...

Адзін супрацоўнік службы дастаўкі ў час адпачынку начальніцы атрымаў заданне штодня адпраўляць пасылкі нейкаму Майклу Фіну. Работнік старанна ўзяўся выконваць даручэнне. Вярнуўшыся з адпачынку, начальніца спалохалася такой «стараннасці» супрацоўніка, паколькі яна прасіла адсылаць «мікрафільм». Няшчаснаму аддадзена было параілі купіць слыхавы апарат і звольніцца.

Часам кар'еру можа сапсаваць нават кавалак піцы. Нейкі менеджар працаваў у кампаніі амаль два гады. Аднойчы пасля абеду ён заўважыў, што калегі пакінулі пасля сябе недаедзеныя кавалкі піцы на стале. Галодны супрацоўнік вырашыў, што дабру не варта прападаць — усё роўна ж выкінуць, і даеў рэшткі. Пазней высветлілася, што піцу збіраліся забраць дамоў супрацоўнікі, а калега іх проста «аб'еў» без дазволу. На перавыхаванне галодны менеджар быў выкліканы да начальніка, які вырашыў пазбавіцца ад такога падначаленага.

У 2009 годзе ў ЗША была звольнена Кімберлі Сван. Прычына звальнення, як і сама сітуацыя, даволі кур'ёзная. Знаходзячыся на працы, Кім памяняла статус у Facebook, заявіўшы: «Як сумна на працы». Начальнік дзяўчыны, знаходзячыся ў яе фрэнд-лісце і будучы таксама анлайн у рабочы час, убачыўшы статус, выклікаў падначаленую да сябе. З парога ён заявіў: «Кім, хопіць сумаваць!» І прапанаваў неабачлівай супрацоўніцы напісаць заяву на звальненне. А вы ўсё яшчэ дабаўляеце начальства ў сябры ў сацыяльных сетках?

■ Zamor'e

## Варона ўкрала пашпарт

**Варона ўкрала пашпарт у грамадзяніна Эстоніі на аўтамабільным пункце пропуску «Іван-горад» у Ленінградскай вобласці, паведамляецца на сайце Паўночна-Заходняга мытнага ўпраўлення ФМС Расіі.**



Падчас працэдуры мытнага афармлення транспартнага сродку грамадзянін Эстоніі дастаў пашпарт, але раптам да яго падляцела варона, выхапіла дакумент і ўзнялася ўверх. Сведкамі інцыдэнту сталі службовыя асобы мытнага паста, яны паспрабавалі дапамагчы грамадзяніну, былі прыцягнутыя кінолагі са службовымі сабакамі. Аднак усе спробы злавіць птушку скончыліся няўдачай. Пашпарт знайшоўся праз два дні. Варона кінула яго недалёка ад пешаходнага пункта пропуску. Дакумент стаў несапраўдным, таму што птушка выправала з яго адзін ліст.

Вясной варона знесла чатырохмесячнага шчанюка пароды чыхуахуа ў жыхаркі аўстралійскага Мельбурна. Паводле яе слоў, птушка схапіла гадаванца лапамі і паляцела.

## Брудны метад

**У новазеландскім горадзе Окленд бізнесмен вываліў 40 тон грязі на парозе кавярні, уладальнік якой быў вінаваты яму грошы, паведамляе Stuff.co.nz.**



Бары Харт сцвярджае, што кавярня не заплаціла яму і яго партнёрам за аказаныя паслугі па ачыстцы і пракладцы каналізацыі. Сума доўгу дасягнула 88 тысяч новазеландскіх долараў (каля 60 тысяч долараў ЗША). У сярэдзіне лістапада Харт апошні раз нагадаў уладальніку ўстановы, што пазыку трэба вярнуць, але грошай так і не дачакаўся. Праз шэсць тыдняў ён адправіў да кавярні чатыры самазвалы з граззю, якая непрыемна пахла. Акрамя таго, Харт паабяцаў дэманціраваць пракладзеныя пад будынкам каналізацыйныя трубы. Калі і гэта не падзейнічае, ён працягне вазіць даўжніку гразь.

## Чыя качка хутчэйшая

**У англійскай вёсцы Біберы адбыліся традыцыйныя гонкі гумавых качак, паведамляе агенцтва UPI.**



На штогадовых спаборніцтвы, якія ладзяць кожны год пасля Раства, прыехалі тысячы гледачоў. На першым этапе гонак у ваду выпусцілі 150 тысяч падсадных качак, якія выкарыстоўваюцца ў якасці прынады. За 10 фунтаў стэрлінгаў удзельнікі мерапрыемства маглі зрабіць стаўку на адну з іх. Таму, чыё чучала першым дасягнула фінішнай лініі, дазволілі выбраць дабрачынную арганізацыю, якой ахвяруюць сабраныя грошы. Затым па плыні адправілі дзве тысячы жоўтых гумавых качак. Стаўка на гэтым этапе складала ўсяго адзін фунт. Прызы атрымалі спонсары 20 качак, якія перасягнулі дыстанцыю хутчэй за ўсіх, і чалавек, які паставіў на «ўдзельніцу», якая фінішавала апошняй.

**Іван КУПАРВАС.** *hvir@zviazda.by*

## Нядзеля, 15 студзеня

### Беларусь 1

**6.45, 17.05** **Меладрама «Правінцыялка».**
**8.30** Народная раніца.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40** **Серыял «Сваты-4»**
**10.50** «50 рэцэптаў першага».
